Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 27 (679) ● 29 верасня ПЯТНІЦА ● Цана 2 кап. Год выдання XX.

## ПЛЕНУМ ЦК КПСС

26 верасня 1967 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум заслухаў і абмеркаваў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. БРЭЖНЕВА «Аб мерах па далейшаму павышэнню дабрабыту савецкага народа».

Пленум заслухаў і абмеркаваў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. М. К. БАЙБАКОВА «Аб праектах Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1968 год і планаў развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1969 і 1970 гады» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. ГАРБУЗАВА «Аб праекце Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1968 год».

Пленум ЦК поўнасцю адобрыў распрацаваныя Палітбюро ЦК КПСС мерапрыемствы па далейшаму павышэнню дабрабыту савецкага народа. (Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР па гэтаму пытанню апублікавана ў газетах.)



САМЫМ НАПРУЖАНЫМ КУРСАМ НА ПРАЦЯГУ ВУЧОБЫ БІЁЛАГІ ЛІЧАЦЬ ТРЭЦІ. НА ЗДЫМКУ: У ЧАС ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА ФІЗІЯЛОГІІ ЖЫВЁЛ. Фота А. Калзета.

## НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Даўнія шэфскія сувязі універсітэта з воінамі Савецкай Арміі, рабочымі і калгаснікамі існуюць ужо шмат гадоў. Але не толькі з пафшэфнымі выхаванцамі трымаюць сувязь нашы самадзейныя артысты. Днямі агітбрыгада універсітэта ў складзе 30 чалавек пабывала ў калгасах Чэрвеньскага раёна, дзе працуюць на ўборцы бульбы нашы студэнты, і дала некалькі канцэртаў.

Перад калгаснікамі і студэнтамі выступалі эстрадны аркестр, якім кіруе А. Д. Вайнштэйн, а таксама студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр гістарычнага факультэта.

Усе канцэрты прайшлі з вялікім поспехам. Усе, каму даводзілася іх слухаць, ацанілі яго з самага лепшага боку, засталіся задаволенымі. Гэтыя канцэрты прынеслі нейкую радасць, свята. А такое заўсёды натхняе на працоўныя поспехі.

Не адным выступленнем самадзейнасці заканчваліся сустрэчы. Лектар-міжнароднік студэнт чацвёртага курса гістфака В. Сініца чытаў лекцыі працоўным вёскі і нашым студэнтам па Тэзісах ЦК КПСС «50 год Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі».

Надоўга застануцца ў памяці калгаснікаў Чэрвеньшчыны цёплыя сустрэчы са студэнтамі БДУ.

К. РАМАЎ.

## КАМУНІСТЫ РАПАРТУЮЦЬ

### Партыйнае жыццё

Пад дэвізам дастойнай сустрэчы слаўнага 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі праходзяць сходы партыйных арганізацый факультэтаў.

Нядаўна з парадкам дня аб падрыхтоўцы да свята Вялікага Кастрычніка прахадзіў партыйны сход выкладчыкаў гістарычнага факультэта.

Выкладчык вну — гэта чалавек, у якога мноства розных абавязкаў: выхаванне студэнтаў, навуковая праца, лекцыі, удзел у розных установах і арганізацыях паза межамі універсітэта. Таму нездарма было вырашана партыйным бюро факультэта ў першую чаргу правесці сход выкладчыкаў-камуністаў. Уласна кажучы, сход быў адкрытым. Тут мелі магчымасць прысутнічаць усе жадаючыя.

Разглядаліся самыя актуальныя пытанні, па якіх выступілі прафесары Л. С. Абэцэдарскі, Ф. М. Нячай, Л. М. Шнеерсон, дацэнты П. З. Савачкін, А. С. Кляўчэня. Шмат увагі было ўдзелена падрыхтоўцы кандыдацкіх дысертацый, метадычных дапаможнікаў, а таксама падручнікаў для сярэдняй школы па гісторыі.

Гістарычны факультэт мае на сваім ліку нямала добрых традыцый. І прыемна адзначыць тое, што яны не толькі трымаюцца, але і развіваюцца, набіраюць новую сілу.

На стале перад сакратаром партыйнага бюро гістфака Д. Б. Мельцарам ляжыць невялікая кніжка, у якой надрукаваны сацыялістычныя абавязацельствы універсітэта. Тут ёсць спецыяльны раздзел гістарычнага факультэта. Чытаем у плане: «1. Падрыхтаваць тры кандыдацкія дысертацыі, (Навуменка Я. П., Міхайлоўскі Л. А., Сідарцаў В. П.)» Што ж атрымалася на самай справе? Усе тры дысертацыі падрыхтаваны да абароны. Акрамя гэтага мерапрыемства, выдан падручнік па гісторыі БССР для сярэдняй школы Л. С. Абэцэдарскага.

У кастрычніку намечана правесці навуковую канферэнцыю, прысвечаную 50-годдзю Савецкай улады, на якой будуць прачытаны цікавыя змястоўныя даклады навуковых супрацоўнікаў факультэта.

Партыйны сход выкладчыкаў гістфака ўсебакова ацаніў пытанне навуковай працы, намеціў канкрэтныя шляхі да новых адкрыццяў у галіне гістарычных навук. Ён з'явіўся важным крокам у ажыццяўленні сацыялістычных абавязацельстваў, якія намечаны ў гонар Вялікага Кастрычніка.

А. Цераховіч.



ГІСТОРЫКАЎ ЗАЎСЁДЫ АКРУЖАЕ ГІСТОРЫЯ.

## КРЭДА ПРАФЕСАРА

Мы часта гаворым і спрачаемся аб тым, ці падобны — і наколькі падобны герой таго ці іншага літаратурнага твора на чалавека ў жыцці. Але ці часта даводзіцца каму-небудзь з нас сустрэць чалавека ў жыцці, які б быў да здзіўляючага падобны на літаратурнага героя, нібы сышоўшага вам насустрач са знаёмых кніжных старонак?

Нядаўна мне давялося сустрэцца з такім чалавекам, які ў хвіліну поўнай адкрытасці прызнаўся, што яго любімы герой — гэта...

Між іншым, не будзем забягаць наперад. Чытачу і не без таго не складае асаблівай цяжкасці дазнацца, які ўвогуле не зусім стандартны ідэал выбраў для сябе прафесар Вафіядзі. Дарэчы, вось мы ўжо і пазнаёміліся з ім: Уладзімір Гаўрылавіч Вафіядзі, доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры электрафізікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Не так даўно да ўсіх гэтых тытулаў прыбавіўся яшчэ адзін — член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР. Я прачытаў аб гэтым у газеце ўжо пасля нашага знаёмства і не паспеў павіншаваць прафесара Вафіядзі, таму што ён да гэтага часу адправіўся ў адно са сваіх бязлікіх падарожжаў.

Упершыню я пачуў аб ім ад студэнтаў-фізікаў, пачуў нешта ў гэтым родзе: «Наш Вафіядзі нейдзе вучыўся на завочным — здаецца, у Ленінградскім універсітэце, на філасофскім...»

Я пайшоў да прафесара Вафіядзі, чакаючы ўбачыць паважанага вучонага, павольнага ў рухах і словах, трохі насмешлівага, як усе «бацькі студэнцтва», якіх любяць і пабайваюцца першакурснікі і аспіранты. А замест гэтага ўбачыў, нягледзячы на густую сівізну, чалавека высокага росту і з юнац-

(Працяг на 2-ой стар.).

## ЦАЛІНА Ў ФОТАЗДЫМКАХ

*У ГУМАНІТАРНЫМ корпусе вісіць вялікі фотастэнд, лепш кажучы, фотагазета, аўтары якой цаліннікі. На здымках, у падтэкстоўках і артыкулах яны расказваюць, як гэтым летам працавалі ў казахстанскіх стэпах. Праўда, паняцце «стэп» намнога звузілася, бо студэнты-цаліннікі зрабілі там вялікія пераўтварэнні. Дзе гуляў вецер, там стаяць жылыя дамы, жывёлагадоўчыя фермы, і ўсё гэта за працоўны семестр!*

*Фотагазета яскрава адлюстроўвае жыццё і працу рамантыкаў на цалінных будоўлях.*

*...Вось загарэлыя хлопцы робяць саман, на другім фотаздымку — кладка сцен з таго ж самага саману. У час абедзеннага перапынку адпачываюць яны там, дзе і працуюць. Але гэта не значыць, што будні іх праходзяць толькі на адной будоўлі. Цаліннікі — жыццярадасны народ, які ўмее пасля цяжкага працоўнага дня павесяліцца, заняцца спортам, пайсці ў госці да мясцовых жыхароў. Усё гэта можна ўбачыць на фотагазеце «Цаліна-67».*

*Ужо зараз першакурснікі з захапленнем глядзяць на фотаздымкі і дзеляцца сваімі уражаннямі. А пасля, адышоўшы крыху ў бок, думаюць, ці не паехаць і ім на наступны год у край рамантыкі.*

*Важна адзначыць, што такія фотагазеты вось ужо некалькі гадоў запар рэгулярна выходзяць на філфаку, а ў гэтым годзе яе стварылі сумесна цаліннікі абодвух факультэтаў—філалагічнага і журналістыкі.*

*Такую карысную справу патрэбна пераняць і ўдарнікам трэцяга семестра іншых факультэтаў універсітэта.*

*П. ГЛЕБКА.*

# Ардэнаносны Універсітэт — 50 годдзю Савецкай улады




Таня Вераб'ёва, член СНТ, надае вялікую ўвагу навукова-даследчым работам па хіміі. Яна пастаянны ўдзельнік рэспубліканскіх і ўсесаюзных студэнцкіх навуковых канферэнцый. Са сваімі дакладамі выступала ў вну многіх гарадоў краіны.

Фота **А. Кадзета.**

## НА ПОЛІ КАЛГАСНЫМ — ВЕСЕЛА, ЯСНА

З таго часу, калі студэнты першай групы IV курса аддзялення рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта выехалі на уборку бульбы ў калгас «Бальшавік» Чэрвеньскага раёна, вёска Дзеруцкое акунулася ў новы рытм жыцця. Кожны дзень вечарамі ліюцца звонкія песні, чуецца музыка, смех, жарты. З першага дня прыезду ажывіўся калгасны клуб. Яго аддалі ў распараджэнне студэнтам адразу ж, як толькі яны прыехалі. На ўсякі выпадак, пакідаючы Мінск, студэнты захапілі з сабой радыёлу. Такая застрахоўка ад смутку аказалася прадбачлівай і карыснай.

З першых дзён пацягнулася да студэнтаў вясковая моладзь, пажылыя калгаснікі. Горача палюбілі пасланцоў універсітэта школьнікі.

Дырэктар мясцовай школы неяк пажартаваў, звяртаючыся да нашых дзяўчат-студэнтак:

— Добрымі вы будзеце педагогамі. Паглядзіце, як ліпнуць да вас школьнікі. Заставайцеся хто-небудзь працаваць у нашай школе.

Вядома, прапанова нядрэнная, але ж наперадзе яшчэ два гады напружанай вучобы. Наперадзе і больш сур'ёзная педагагічная практыка, тэарэтычная падрыхтоўка.

Калгаснікам падабаецца ў студэнтаў не толькі весялосць, але і багатыя веды, якія юнакі і дзяўчаты стараюцца ўтрымліваць не толькі пры сабе, але і аддаваць іх іншым. На полі, у час абедзенага перапынку, вечарам, у клубе, пасля работы студэнтаў акружаюць калгаснікі, каб паслухаць новыя весткі з газет і больш шырокую інфармацыю на міжнародныя тэмы.

Але хіба толькі адны танцы, песні, палітінфармацыі змаглі б настолькі падняць аўтарытэт нашых студэнтаў сярод мясцовага насельніцтва? Не. Калгаснікі ў асобе будучага інтэлігента ўбачылі нешта большае. Бо не слова студэнта, а яго дзейсная праца, дзе ён можа праявіць сябе з таго ці іншага боку, могуць сказаць аб ім тое, чаго ён заслугоўвае на самай справе.

— Да вашых студэнтаў у нашым калгасе так яшчэ ніхто не працаваў, — гаворыць брыгадзір калгаса І. К. Няборскі.

Гэта, мабыць, і сапраўды так. Шчырымі ў працы студэнты паказалі сябе адразу ж. Кожны дзень юбілейнага года на калгасным полі студэнты адзначаюць перавыкананнем нормы. Замест 680 кг. бульбы яны выбіраюць па 800—900 кг. Гэта дае магчымасць зарабляць каля 4 рублёў на працадзень. Добры прыклад у працы заўсёды паказваюць староста групы Г. Кукуюк, парторг А. Ярмоленка, М. Марыніч, Т. Капуцкая, Я. Дударэвіч, Н. Гайдалёнак і многія іншыя.

Лічаныя дні засталіся да ад'езду ў родны універсітэт. На развітанне з калгаснікамі студэнты даюць канцэрт мастацкай самаадзейнасці.

Філалагічны факультэт будзе вітаць сваіх пасланцоў горача і з пашанай.

**К. ВЕРБІН.**

*У камітэце камсамола адбылася нарада камсоргаў першых курсаў. Сакратар камітэта М. Ціва расказаў ім аб традыцыях камсамоліі БДУ, аб метадах і характары работы з моладдзю і галоўную ўвагу спыніў на тым, як лепш падыйсці да свята Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. На нарадзе са сваімі думкамі і прапановамі выступілі камсоргі старэйшых курсаў.*



**Крос, прысвечаны слаўнаму 50-годдзю Вялікага Кастрычніка сёлета быў, як ніколі, масавым і арганізаваным. Асабліва адказна да гэтага мерапрыемства падышлі першакурснікі філалагічнага, фізічнага і многіх іншых факультэтаў.**

**НА ЗДЫМКУ: у час забегу на 3000 метраў.**

## *Імі ганарыцца універсітэт*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

кімі агеньчыкамі ў вачах.

Асіпарнты, якім ён тлумачыў нейкую звышразумную схему, судзячы па ўсяму, не толькі не пабайваліся яго, а, наадварот, трымаліся з ім настолькі свабодна, што для пабочных гэта здавалася амаль не фамільярнасцю. На самай жа справе гэта была, відавочна, проста непасрэднасць людзей, з галавой увайшоўшых у навуку, не стрыманая рамкамі абсалютна ніякіх умоўнасцей. У гэты момант яны былі роўнымі перад тварам яго вялікасці Навуковага Пошуку — аспірант і прафесар, і з аднолькавым правам на адкрыццё кожны выстаўляў свой довад, зусім забыўшыся аб «табелі рангаў», і якую б ні было субардынацыю. А калі ўсё было высвенена, кожны зноў стаў самім сабой: прафесар — прафесарам, аспірант — аспірантам, і з нейкай асаблівай пачцівасцю, аб якой хвіліну назад нельга было і падазраваць, апаненты паціснулі адзін аднаму рукі, дамовіліся аб наступнай сустрэчы. І ў гэтай пачцівасці я пазнаў новага для сябе і, відавочна, сапраўднага Вафіядзі — таго самага, (я аб гэтым дазнаўся пазней), які, убачыўшы свайго студэнта, яшчэ за дзесяць крокаў здымае перад ім шляпу. Недалёкія студэнты за гэта лічаць яго дзіваком, разумныя бачаць у гэтым дзівацтве праяўленне вышэйшай інтэлігентнасці.

Размаўляць з прафесарам аб яго асноўнай рабоце — навуковай аказалася нечакана цяжка. Аўтар некалькіх дзесяткаў навуковых работ, ён адказваецца назваць хоць бы адну з іх, з нейкай асабліва мяккай тактычнасцю даючы зразумець, што для паглыблення ў гэтую галіну фізікі трэба мець спецыяльны пропуск. Але мой тактычны субяседнік, далікатна пераводзячы размову на другую тэму, неяк загадкава запрашае мяне да свайго пісьменнага стала.

Прафесар дастаў і выклажыў перада мной мноства зашклёных яшчыкаў з акуратна наколатымі матылькамі ўсіх, як мне здалося, атрадаў, падатрадаў і відаў, якія толькі існуюць на зямлі. Пазней аказалася, што не, не ўсіх, бо абсалютна ўсеабдымнай калекцыі пакуль што ніхто не мае. Затое ў калекцыі прафесара Вафіядзі прадстаўлен амаль увесь матыльковы свет Еўрапейскай часткі Саюза. Там, дзе не змог пабываць і паганяцца з сачком за дзікім матыльком сам прафесар (праўда, такіх куткоў — у рэспубліцы, у крайнім выпадку — засталося не так ужо і многа), гэта робяць за Вафіядзі яго шматлікія вучні, якія знаюць «хоббі» свайго настаўніка, — ад студэнтаў да кандыдатаў навук, адзін з якіх не палянаваўся прыслаць нейкага асаблівага матылька нават з самага Сахаліна.

— Навошта вам, фізіку, гэтая біялагічная калекцыя? — пацікавіўся я і пачуў адказ, які здзівіў мяне сваёй нечаканай прастатой.

— А хіба гэта не цікава — ведаць, якія матылькі жывуць на зямлі?

Я зразумеў, што перада мной чалавек, для якога смага пазнання, імкненне да адкрыццяў не змяншае і не можа зменшыцца ніякімі навуковымі ступенямі і тытуламі, што няма і не можа быць у такіх людзей нейкай вузкай спецыялізацыі, а ёсць адзін усеабдымам «шырокі профіль», які ахоплівае ўсё акружаючае настолькі, наколькі можа яго ахапіць. «Хачу ўсё ведаць; альбо не, дакладней: «Хачу ведаць з кожным днём як мага больш», — вось, мне здаецца, жыццёвае крэда прафесара Вафіядзі.

Дасягнуўшы незвычайных глыбінь у галіне «сваёй навукі» фізікі, якую ён выбраў справай жыцця, і напісаўшы некалькі дзесяткаў навуковых работ, гэты чалавек — доктар навук, прафесар — гарыць жаданнем ведаць, як першакласнік, упершыню адкрыўшы буквар. Вядомая і ўвогуле дастаткова азбучная ісціна, якую мы часта забываем у мітусні будняў, па-моему, ніколі не перастае турбаваць прафесара Вафіядзі.

На шостым дзесятку гадоў ён раптам бярэцца за вывучэнне чэшскай мовы. Знаходзячыся неяк у навуковай камандзіроўцы ў Германіі, прафесар Вафіядзі чытаў лекцыі на нямецкай мове; ён валодае таксама англійскай і французскай. Калі б у сутках было сорак восем, а яшчэ лепш—дзевяноста шэсць гадзін замест дваццаці чатырох, прафесар даўно ўжо стаў бы лінгвістам-паліглотам, суднаканструктарам, астраномам... Цяжка нават пералічыць усе захапленні гэтага чалавека, ды і ці варта пералічваць іх? Куды цікавей

## КРЭДА

заглянуць у біяграфію Вафіядзі. Тады, у крайнім выпадку, можна зразумець, «адкуль пайшло есмь» усё тое, што сёння так прыемна здзіўляе ў прафесары яго навуковых калег і шматлікіх знаёмых.

У трыццатых гадах малады Вафіядзі прыехаў з правінцыяльнага Варонежа ў Ленінград. Сціплы чарцёжнік-канструктар вырашыў стаць астрафізікам. Паступіўшы на завочнае аддзяленне фізмата Ленінградскага універсітэта, ён адначасова ўладкаваўся на работу лабарантам у даследчы інстытут. Працаваць у лабараторыі вядомага акадэміка А. А. Лебедзева было цікавей, чым вучыцца, і таму за восем гадоў да пачатку вайны студэнт паспеў «дасягнуць» толькі да чацвёртага курса. Так і атрымалася, што кандыдацкую дысертацыю Вафіядзі абараніў, не маючы нават дыплома аб вышэйшай адукацыі, — выпадак, трэба сказаць, даволі рэдкі ў гісторыі прысуджэння навуковых ступеней.

Калегі па лабараторыі прыпаднеслі яму тады, у галодны і халодны ваенны год, калі ўвогуле было не да гумару, жартоўны альбом, дзе новы кандыдат навук быў паказан на першай старонцы ў даспехах Дон-Кіхота. Гэты альбом з дасціпным вершаваным прысвячэннем Уладзімір Гаўрылавіч старанна беражэ як

# ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ

Калі зайсці ў галоўны корпус Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, то адразу можна ўбачыць вялікую Дошку гонару. Сярод мноства фатаграфій — здымкі тых, хто ўдастоен вышэйшай студэнцкай узнагароды — Ленінскай стыпендыі. Заслужыць такую ўзнагароду вельмі цяжка. Трэба правучыцца пяць семестраў, не атрымаўшы ніводнай «чацвёркі». Кожны факультэт мае толькі аднаго ленінскага стыпендыята. Ёсць ён і на матэматычным факультэце. Гэта — Міхаіл Самусік.

...Я ўбачыў маладога чалавека з адкрытым, па-юнацку светлым тварам; разумныя, дапытлівыя вочы глядзелі скрозь шкло вялікіх акуляраў.

Мы пазнаёміліся. Слова за слова, і я даведаўся пра цікавую і цярністую дарогу Міхаіла Самусіка да яго любімай навукі — матэматыкі.

Да вёскі Трасцяніца, што на Брэстчыне, дзе знаходзілася школа, ад яго роднай вёскі было кіламетраў пяць. І па гэтай дарозе, да дробязей знаёмай яму, хадзіў Міша ў школу. І толькі ў старшых класах адчуў, з якой лёгкасцю пачалі рашацца матэматычныя задачы. Можа «прачнуўся» скрыты талент? Першым гэта зразумеў выкладчык матэматыкі. З усіх вучняў ён адразу вылучыў таленавітага хлапчука. Талент — гэта той жа самы самародак: яго трэба знайсці і адшліфаваць. Самародкі шукае золаташукальнік, а таленавітых, здольных вучняў — выкладчык.

І, зразумела, што калі Міша Самусік скончыў школу, для яго не было іншай дарогі, акрамя дарогі ў матэматыку. Таму і паехаў ён паступаць у Брэсцкі педінстытут на матэматычны факультэт. Вельмі добра здаў усе прадметы. Заставалася фізіка. І тут яго чакала непрыемнасць.

Цяпер Міша жартуе: «Двойку, якую я забыўся паставіць у назоўнік дробу, паставілі мне на экзамене». А тады было вельмі крыўдна. Але хлопец хацеў вучыцца. І ён паступае ў Брэсцкае педвучылішча. Праз два гады Міхаіл заканчвае яго і пачынае выкладаць у адной са школ Брэсцкай вобласці.

А праз год Міхаіл Самусік стаў воінам Савецкай Арміі. Тут жа ўступіў у партыю. І ў арміі не забываў Міхаіл матэматыку. З радасцю ўзяўся ён весці матэматычны гурток у падшэфнай школе. Займаючыся са сваімі выхаванцамі, працуючы над сабой, Міхаіл марыў паступіць ва універсітэт. Зразумеў, што не можа ўжо без матэматыкі.

Пасля дэмабілізацыі юнак стаў студэнтам завочнага аддзялення матэматычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

І зноў пачалося выкладанне ў школе. На гэты раз ужо ў старшых класах. Многія з вас здзівяцца: як гэта выкладанне такога складанага прадмета даверылі студэнту першага курса?.. Можа вы і маеце рацыю. Але ўспомніце, як Аркадзь Гайдар у дваццаць тры гады камандаваў дывізіяй. Так, сапраўды, прыйшлося Міхаілу Самусіку ездзіць у раёна і прасіць, каб далі яму весці любімы прадмет. І яму пайшлі насустрач, далі месца выкладчыка матэматыкі ў Люблянскай школе. На маё пытанне, ці цяжка было выкладаць, Міша адказаў: «Не». І сапраўды, напэўна, калі чалавек займаецца любімай справай, яму не можа быць цяжка, нават калі часам не хапае ведаў і вопыту, калі даводзіцца па начах праседжваць над кнігамі.

Іншае трывожыла Міхаіла: вельмі шмат часу займала выкладанне. Ды і веды, адчуваў, былі не тыя, якія можна было атрымаць, займаючыся на стацыянары. І яго мара ажыццявілася.

Яшчэ не ведаючы як след адзін аднаго, юнакі і дзяўчаты выбралі Мішу старастам. І трэба сказаць, што ён апраўдаў давер'е групы. Ужо чатыры гады Міхаіл Самусік — нязменны староста. Калі ездзілі на цаліну, атрад выбраў яго сваім камісарам. А зусім нядаўна Міхаіл стаў членам партбюро.

Але ўсё гэта было потым. А спачатку былі цяжкія нязвыклыя пасля такога доўгага перапынку дні вучобы. Першая сесія здадзена на «выдатна». Цяпер такіх сесій ужо сем за яго плячыма. Але асабліва памятная яму пятая, адна з самых цяжкіх. Пасля яе ён стаў ленінскім стыпендыятам.

На чацвёртым курсе ў студэнтаў - матэматыкаў ужо адбылося размеркаванне па спецыяльнасцях. Кожны выбраў найбольш цікавую для сябе галіну любімай навукі. Міша Самусік выбраў «Краявыя задачы».

Мы гутарым з Мішам у адной з універсітэцкіх аўдыторый. І калі размова датычыць матэматыкі, Міша не можа спакойна ўседзець на месцы. Ён падыходзіць да дошкі і ўпэўнена даказвае той ці іншы факт пераканаўчымі довадамі, зразумелымі не толькі матэматыку.

Неяк лічыцца, што матэматыка — навука сухая, больш таго, чыста тэарэтычная. Але гэта далёка не так. А тэма «Краявыя задачы», над якой пачаў працаваць Міша, цесна звязана з практыкай. Яна неабходна і для знаходжання формы крыла самалёта, і для будаўніцтва плаціны...

Усё гэта вельмі цікава, і Міхаіл, як гавораць, з галавой паглыбіўся ў работу. Калі ж курсавая работа яму ўдасца, «Краявыя задачы» стануць тэмай яго дыпломнай работы. Таму многа гадзін праводзіць Міша Самусік у чытальных залах бібліятэкі; дома і нават на вуліцы не пакідае яго ў спакоі гэтая тэма.

«Часу зусім мала,— гаворыць Міша,— ледзь хапае для таго, каб усё паспець». А паспець трэба многа: паглядзець паспяховасць курса, пабываць на пасяджэнні партбюро, выканаць заданне на заўтра,— наогул усяго не пералічыць. І рабіць усё трэба так, як Міша прывык з дзяцінства: з захапленнем, да канца.

Мы выходзім з аўдыторыі. Да Мішы падыходзяць таварышы, просяць растлумачыць штосьці. Ён ахвотна згаджаецца. Ён нікому не адмаўляе. Магчыма, тут праўляецца прывычка настаўніка, магчыма, самому хочацца падзяліцца сваімі ведамі, а хутчэй за ўсё, і тое, і другое. Такі ўжо ён чалавек, Міхаіл Самусік, — ленінскі стыпендыят.

**В. ДОБКІН.**

## ПАКУЛЬ РЭДКАЛЕГІІ РАСКАЧВАЮЦЦА

**На ўліку насценнай газеты «Хімік» — органа партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый хімічнага факультэта шмат добрых спраў. На аглядзе насценнага друку ў гэтым годзе яна паднялася з перадапошняга месца, якое яна займала да гэтага, на трэцяе. Рэдактар «Хіміка» Генадзь Кажушкоў змог згуртаваць вакол сябе выдатны калектыў рэдкалегіі, сапраўдных аматараў газетнай справы.**

**Выдатны прыклад зрабіла рэдкалегія і цяпер. Яна першай ва універсітэце выпусціла насценгазету.**

**І. МЕЛЬНІК,**
**студэнт.**

**АД РЭДАКЦЫІ:**

**Час вучобы бяжыць. Прайшоў месяц. У выкладчыкаў, студэнтаў адказная пара—ідзе напружаная падрыхтоўка да сустрэчы 50-годдзя Савецкай улады, вось-вось пачнуцца справаздачы і выбары ў партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях, поўным ходам праходзяць семінарскія заняткі, сустрэчы першакурснікаў з пісьменнікамі і старэйшымі камуністамі і многае іншае.**

**Аднак, насценгазеты, да якіх мы так усе прывыклі, маўчаць, і ў гэтым маўчанні адчуваецца нешта сумнае і трывожнае. Ідзеш па факультэту, глядзіш, і ўсё, здаецца, нечага не хапае.**

**Пара, паважаныя рэдактары, прыступіць да справы. Выхаду насценгазеты чакае кожны студэнт.**



Старанна трэніруецца на спартыўных снарадах кандыдат у майстры Юра Міхайлоўскі.
Фота А. Кадзета.

## *Імі ганарыцца універсітэт*

# ПРАФЕСАРА

самую дарагую рэліквію і прызнаецца, што Дон-Кіхот — гэта і ёсць яго любімы герой.

Можна здзівіцца «нестандартнасці» такога ідэала, але, падумаўшы добра, варта прыняць гэта сур'ёзна. Прыглядзеўшыся уважліва, можна ўгадаць пад мяккай інтэлігентнасцю мяцежны дух Дон-Кіхота. Драўляныя коп'і і ветраныя мельніцы тут, зразумела, зусім не прычым. Але, згадзіцеся, стаць кандыдатам навук без самага звычайнага дыплома вну; рыхтуючы доктарскую дысертацыю, толькі заканчваць універсітэцкі курс; жыць у палатцы на ледзяным схіле Эльбруса, спрабуючы знайсці доўгахвалевае выпраменьванне Сонца; на шостым дзесятку гадоў вывучаць чэшскую мову, ганяцца з сачком за матылькамі і будаваць катамаран для падарожжаў па Камсамольскім возеры... згадзіцеся, усё гэта нешта гаворыць аб чалавечым характары.

Каб глыбей пазнаць гэты не зусім звычайны характар, сяджу на лекцыі прафесара Вафіядзі, якую ён чытае студэнтам універсітэцкага фізфака. Я і раней прадбачыў, што чытаць лекцыю такі чалавек павінен неяк па-асабліваму, перад пачаткам лекцыі, прызнаюся, перасцерагаўся: наўрад ці што-небудзь зразумею, адна назва спецкурса чаго варта — «Фізіка космаса»! Відаць нешта касмічна неабдымнае і касмічна недасягальнае. Аднак прафесар так па-зямному бярэ анучку і так старанна, не спяшаючы выцірае ёю дошку, што мне з усімі маімі перасцярогамі проста не верыцца, што цяпер на гэтай дошцы з'явяцца якія-небудзь недасягальныя розуму формулы.

І сапраўды, на дошцы з'яўляюцца ніякія ні формулы, а імёны. Іо, Амальтэя, Еўропа, Каліопа, Ганімед. Толькі ў даным выпадку гэта не персанажы старажытнагрэчаскіх трагедый, а спадарожнікі планеты Юпітэра. Іх, аказваецца, усяго дванаццаць. І яшчэ, аказваецца, у момант праходжання ценю спадарожніка па паверхні Юпітэра тэмпература ў гэтым месцы не паніжаецца, як варта было чакаць па логіцы прадметаў.

Толькі пасля таго, як мая рука пачынае выводзіць у блакноце паўзабытыя са школьных часін значкі і індэксы, абазначаючыя дыяметры, масу, шчыльнасць, тэмпературу паверхні розных планет, я ўрэшце, заўважаю гэты блакнот, які невядома чаму ляжыць у мяне на каленях, і пачынаю здзіўляцца, чаму гэта я раптам прыняўся запісваць усе гэтыя наўрад ці патрэбныя мне падрабязнасці. Але здзіўляцца доўга няма часу, трэба паспець запісаць другую навіну: аказваецца, нешта падобнае вядомаму кольцу Сатурна, апаясвае, відаць, і нашу Зямлю. І дзе-небудзь на далёкай абжытай планеце першакласнікі-марсіяне малююць Зямлю ў такім выглядзе, як на матацыклах «Іж» паказан Сатурн.

А тайная шчыліна Кассіні, а загадка адваротнага руху Ўрана вакол Сонца...

Я выходзіў з лекцыі прафесара Вафіядзі, начыста забыўшыся, што прыйшоў сюды па нейкія мастацкія дэталі да партрэта героя будучага нарысу. Маё філалагічнае ўяўленне захапіла касмічная фізіка. У воблаку толькі што пачутых навуковых гіпотэз і загадак светабудовы плыў я па Ленінскім праспекце, і ў галаву лезлі пытанні, хоць і не маючыя прамых адносін да толькі што праслуханай лекцыі. А на самай справе, чаму будова маленькай часцінкі рэчыва — малекулы — так паражальна нагадвае будову галактычнай сістэмы? І дзе ключ да загадкі, заданай чалавецтву яшчэ піфагарыйцамі, якія сцвярджалі, што ў аснове будовы сусвету закладзен семярычны код? На самай справе, людзі знаюць сем цудаў свету, сем смяротных грахоў, сем узростаў чалавека, сем мораў, сем дочак Атлана — Плеяд, сем узроўняў ада, сем таноў музычнай гамы, сем асноўных колераў спектра, сем дзён тыдня. Калі гэта проста супадзенне, то як растлумачыць выключнае адкрыццё савецкага фізіка І. П. Герловіна, які зрабіў тысячы разлікаў, звязаных з так званымі элементарнымі часцінкамі, і самым здзіўляючым стала не тое, што элементарныя часцінкі маюць складанейшую структуру, а тое, што ў аснове структурнага раду гэтых часцінак Герловін убачыў закладзеную ўсё тую ж сямёрку!

Мы да ўсяго прывыклі, мы нічаму не здзіўляемся— ні зоркам, ні загадкам, якія тоўпяцца навокал, хапаючы нас за рукаў. Мы ведаем усё і ў той жа час вельмі мала. Адчуць гэта яшчэ раз мне дапамагла толькі адна лекцыя — лекцыя прафесара Вафіядзі. І зноў, успамінаючы шматлікія «хоббі» прафесара і звязваючы ўсё гэта з яго лекцыяй, я зразумеў: не, не павінна быць граніц чалавечай зацікаўленасці, чалавечай дапытлівасці перад загадкавым тварам яе вялікасці Прыроды. І ўсё, што служыць задавальненню гэтай дапытлівасці,—разумна і варта глыбокай павагі. У тым ліку калекцыяніраванне матылькоў.

Няхай хто-небудзь назаве гэта дзівацтвам, донкіхоцтвам ці яшчэ неяк. Для мяне, напрыклад, гэтае дзівацтва называецца смагай жыцця, смагай пазнання. І гэтаму дзівацтву нельга не пазайздросціць.

На шчасце, і ў дваццатым стагоддзі жывуць сярод нас Дон-Кіхоты. Час змяніў іх: замест недарэчных металічных лат яны носяць лаўсанавыя касцюмы і сінтэтычныя гальштукі, а бескарыснаму штурму нікому не патрэбных ветраных мельніц аддаюць перавагу штурму мю-мезонаў і Галактык — бясконца малога і бясконца вялікага. І пры ўсім пры гэтым неяк умеюць не забываць аб самых звычайных зямных матыльках, якія пры ўсёй сваёй звычайнасці таксама ёсць цуд і таксама, па сутнасці, загадка нічуць не меншая, чым бясконцасць свету.

Прынцыповыя, бескампрамісныя ў сур'ёзным і незвычайныя ў сваіх «хоббі», жывуць сярод нас Дон-Кіхоты. Дзякуй ім!

**А. КАРЭЛІН.**

## Цаліна. Год 1967. Цаліна. Год 1967.

# НА ШЭСЦЬДЗЕСЯТ СЁМЫМ ГАРЫЗОНЦЕ

ТАМ, дзе працавалі нашчадкі Архімеда, стэп падобны на сухар. Дзіка глядзіць ён на лянівых вярблюдаў, як бы молячы просіць:

— Піць, піць, піць...

Сорак восем гадоў назад гэтая «суш» была густа паліта гарачымі кроплямі мужных і адданых Радзіме сэрцаў. Васіль Рыгоравіч Шмялёў, намеснік камандзіра аднаго з эскадронаў 25-й Чапаеўскай дывізіі ўспамінае: «Баі ішлі гарачыя. Нягледзячы на няроўныя сілы, белаказакі былі пасечаны насмерць»...

Цяпер тут працуюць беларускія студэнты. Суровы, дзікі і гарачы стэп не чакаў іх.

АЛЕ 107 матэматыкаў трох атрадаў БДУ імя У. І. Леніна высадзіліся, выстраіліся і вытрымалі. Кроплі Урала-Кушумскага воднага канала ўжо прасочваюцца праз створ галоўнага жалеза-бетоннага шлюза «Ліман—53». Вось-вось, дзевяць тысяч гектараў сухой зямлі нап'юцца церпкай уральскай вады. Хутка на апошнім вадавыпуску камандзір «Эўрыкі» Рыгор Адаменка выводзіць надпіс: «Матфак БДУ імя У. І. Леніна, 1967 год».

УСЁ нараджалася занава сярод стэпу і сонца. Хлопцы зразумелі, што без міжатраднай камуны, без спецыялізацыі ім прыдзецца цяжкавата. Знялі лішніх заўгасаў, кухараў, дняvalьных. На вакантныя месцы залічылі вольных лектараў і піянерважатых.

У хлопцаў з'явіўся бадзёры настрой, упэўненасць у сваіх сілах, сваіх магчымасцях. Наладзілася вытворчасць. На аб'екты пайшлі адборныя, комплексныя брыгады, у якіх прыжыўся паточны метад будаўніцтва. Брыгады Мікалая Дзядок і Віктара Дубіча высякалі катлаваны. Бетоншчыкі брыгад Эдзіка Ціхно і Валеры Бабіцкага ўзялі складаную арматуру і рабілі «вочы» з бетоннай апраvай.

На дамбах Алег Галіноўскі, Саша Пятрушэня, Валодзя Кандраценка выводзілі аткосы. Марыя Ладуцька з Таняй Цішкавай замазвалі шчыліны ў трубах і чыталі «Хождение по мукам».

ХЛОПЦЫ і дзяўчаты за 40 дзён выкінулі 1900 м³ бетона па дакладна разлічанаму накіраванню. Вакол блакітнай ленты канала вырасла 67 вадавыпускаў, 7 перагароджваючых і 10 прапускных збудаванняў і адзін галоўны шлюз.

Гэта і ёсць «Ліман-53», які будуе зводны атрад матэматыкаў БДУ. Той ліман, які бялее каля 67-га гарызонта.

67 — гэта яшчэ і хуткасць машын, якія вязуць «гарачы» бетон на апошні пункт. Не выцiснеш спідометр да такой мяжы, бетон засохне, а сухі — ліман не прымае. 67 — гэта столькі было спартыўных сустрэч і канцэртаў з моладдзю акружаючых пасёлкаў, гэта столькі было прачытана лекцый і такой колькасці дзяцей былі павязаны піянерскія гальштукі.

І НАРЭШЦЕ 67 — гэта 50 год Савецкай улады. Слаўны юбілей студэнты вырашылі сустрэць здачай новага лімана. На пабудову яго патрабавалася 35230 чалавекагадзін. Дзякуючы ўведзенай спецыялізацыі, байцы зводнага атрада «Эўрыка» патрацілі ўсяго 28 тысяч. Гэта 20% сэканомленага рабочага часу.





Такі 67 гарызонт. На ім па закону дзеяння і супрацьдзеяння працавала дружная сям'я матэматыкаў, якая змагла «абламаць» яршыстасць галоднага стэпу.

Уральская вобласць.

**А. КАДЗЕТ.**
**У. ВЯЛІЧКА.**

# *ЛЮБІМЫ НАСТАЎНІК І СЯБРА*

**На днях хімічны факультэт віншаваў свайго ветэрана, аднаго з самых любімых і паважаных членаў навукова-выкладчыцкага калектыву старшага выкладчыка кафедры неарганічнай хіміі Лідзію Іванаўну Малішэўскую ў сувязі з пераходам на пенсію.**

**Сорак год сваёй слаўнай працоўнай дзейнасці Лідзія Іванаўна аддала пачэснай справе навучання і выхавання студэнцкай моладзі, якая выбрала сваёй спецыяльнасцю хімію.**

**З года ў год з першага дня існавання нашага факультэта Лідзія Іванаўна з вялікім уменнем і любоўю прызвычайвала першакурснікаў да асноў хімічнай навукі, вучыла майстэрству хімічнага эксперыменту. На старэйшых курсах яна вучыла і методыцы выкладання хіміі, дапамагала выкладаць упершыню ў жыцці ўрокі ў час педагагічнай практыкі, кіравала дыпломнымі работамі. З вялікім тактам і з сапраўднымі мацярынскімі клопатамі і ўвагай яна дапамагала маладым пачынаючым хімікам пераадольваць свае дзіцячыя хваробы, выходзіць пераможцамі ў барацьбе з сустрэчнымі цяжкасцямі, з няўпэўненасцю ў сабе. Як ніхто іншы, яна прыцягвала сімпатыі сваіх вучняў і вучаніц, якія заўсёды бачылі ў ёй не толькі вопытнага настаўніка, але і старэйшага таварыша і сябра, з якім можна падзяліцца і параіцца па кожнаму хвалюючаму пытанню. З соцен вучняў, якія прайшлі школу Лідзіі Іванаўны, многія цяпер з'яўляюцца вядучымі супрацоўнікамі нашага факультэта, іншых вну і навуковых устаноў рэспублікі. Яшчэ большая колькасць выхаванцаў паспяхова працуе ў школах і на прадпрыемствах. Усе яны з нязменнай цеплынёй і падзякай успамінаюць гады, праведзеныя пад кіраўніцтвам Л. І. Малішэўскай.**

**Лідзію Іванаўну ўспамінаюць і паважаюць не толькі былыя яе студэнты, але і навуковыя супрацоўнікі хімічнага факультэта, якім яна ахвотна дапамагала рабіць першыя крокі на навуковай глебе. Знаходзячыся ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў эвакуацыі, Лідзія Іванаўна самаадданa працавала ў вну і навуковых установах сярэднеазіяцкіх рэспублік. Вярнуўшыся пасля ў вызвалены Мінск, яна прымала самы дзейсны ўдзел у аднаўленні лабараторый кафедры.**

**Шмат гадоў была Лідзія Іванаўна бязьменным казначэем універсітэцкай касы ўзаемадапамогі, была куратарам студэнцкіх груп. Сціплая, але ганаровая і самаадданая праца Лідзіі Іванаўны шмат разоў адзначалася падзякамі і граматамі рэктарата. Савецкі ўрад узнагародзіў яе медаллю «За доблестную працу ў Вялікай Айчыннай вайне», Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Універсітэцкі калектыў неаднаразова выбіраў яе сваім дэпутатам у Кастрычніцкі раённы Савет, і гэтае давер'е Лідзія Іванаўна апраўдала.**

**Прысутныя на ўрачыстасцях Лідзіі Іванаўны прарэктар Л. В. Валадзько, дэкан факультэта Ф. М. Капуцкі, загадчык кафедры неарганічнай хіміі В. В. Свірыдаў пад агульныя адабрэнні прысутных высока ацанілі шматгадовую плённую працу і выказалі ўпэўненасць, што яна і надалей захавае непарыўныя сувязі з універсітэтам і будзе аказваць пасільную дапамогу ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.**

**Выказваем вялікае дзякуй Лідзіі Іванаўне і жадаем ёй доўгіх гадоў жыцця, радасці і асабістага шчасця.**

**СТУДЭНТЫ, ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКІ КАЛЕКТЫЎ ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.**



*Студэнты БДУ імя У. І. Леніна на беразе ракі Урал.*

Фота **У. Філатава.**

# ДА ВЕДАМА НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

## ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ЧАСОПІС «ФІЛАЛАГІЧНЫЯ НАВУКІ».

У часопісе друкуюцца артыкулы па важнейшых праблемах літаратуразнаўства і лінгвістыкі.

У цэнтры ўвагі заўсёды знаходзяцца праблемы вывучэння структуры рускай мовы — яе фанетыкі, марфалогіі, сінтаксісу, словаўтварэння і лексікі, а таксама гісторыі і дыялекталогіі гэтай мовы. Асвятляюцца пытанні вывучэння заходнееўрапейскіх і ўсходніх моў.

Распрацоўка новых метадаў вывучэння мовы, развіццё тэорыі савецкага мовазнаўства, крытычнае асведамленне вопыту зарубежнай навукі — усё гэта з'яўляецца задачамі часопіса, якія ён пастаянна вырашае, публікуе найбольш цікавыя выступленні вучоных па гэтых навуковых праблемах.

Часопіс імкнецца ставіць некаторыя актуальныя праблемы мовазнаўства, якія носяць дыскусійны характар, імкнучыся ў спрэчках выявіць ісціну.

У мэтах знаёмства чытачоў з найбольш важнымі работамі па мовазнаўству, якія выйшлі як у нашай краіне, так і за мяжой, часопіс рэгулярна друкуе водгукі і рэцэнзіі на гэтыя работы.

У літаратуразнаўчых артыкулах часопіса ў будучым годзе знойдуць адлюстраванне найбольш актуальныя пытанні савецкага літаратуразнаўства.

З тэорыі літаратуры будуць разглядацца праблемы творчага метаду і стылю, заканамернасці развіцця літаратурнага працэсу і літаратурных накіраванняў, формы і зместу, вобраза аўтара і апавядальніка і іншыя.

Частка артыкулаў будзе прысвечана пытанням гісторыі рускай літаратуры ад старажытнага перыяду да сучаснай савецкай літаратуры, зместам якіх з'явіцца вывучэнне ідэйна-мастацкіх сувязей, праблематыкі, паэтычнай своеасаблівасці і месца аналізуемага твора ці пісьменніка ў гісторыі літаратуры.

Значнае месца будзе ўдзелена ў часопісе праблемам класічнай і сучаснай прагрэсіўнай зарубежнай літаратуры.

Рэгулярна будуць друкавацца таксама агляды артыкулаў з часопісаў: «Вопросы литературы», «Русская литература» і іншых.

АТ 17092. Зак. 1505. **Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106, тэл. Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Нам. рэдактара П. ТКАЧОЎ.**